## Праект дзяржпраграмы па развіцці меліярацыі на 2011—2015 гады распрацаваны ў Беларусі

Аб гэтым паведаміў журналістам **намеснік дырэктара дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Мінсельгасхарча Уладзімір ЯЎПАК**, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**.

Праектам дзяржпраграмы прадугледжваецца правесці ў наступнай пяцігодцы рэканструкцыю меліярацыйных сістэм на плошчы каля 400 тыс. га. «Мы спадзяёмся, што ўсе запланаваныя аб'екты будуць аднаўлены да канца 2015 года і прыведзены ў рабочы стан», — падкрэсліў Уладзімір Яўпак. На выкананне праграмы спатрэбіцца Br4,5 трлн. Яна будзе фінансавацца за кошт рэспубліканскага бюджэту. Уладзімір Яўпак адзначыў, што на праграму па развіцці меліярацыі на 2006—2010 гады прадугледжвалася выдзяленне Br1,2 трлн. Праект праграмы па меліярацыі на 2011—2015 гады ўжо ўзгоднены з аблвыканкамамі і ўсімі зацікаўленымі ведамствамі — Мінпрыроды, Мінэканомікі, Мінфінам і Дзяржкамітэтам па маёмасці. Да канца чэрвеня ён будзе перададзены на разгляд ва ўрад.

## БАЗА ЗВЕСТАК НЕСАПРАЎДНЫХ ДАКУМЕНТАЎ ПАЧАЛА ДЗЕЙНІЧАЦЬ У БЕЛАРУСКІХ ПУНКТАХ ПРОПУСКУ

**Пра гэта БЕЛТА паведаміў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка.**

Паводле яго слоў, Дзяржпагранкамітэтам сумесна з зацікаўленымі ведамствамі завершана стварэнне такой базы і вызначаны парадак работы з ёй. У гэтым выпадку размова ідзе аб дакументах, што засведчваюць асобу і даюць права на перасячэнне мяжы, і прызнаны несапраўднымі. Як правіла, гэта раней украдзеныя або згубленыя дакументы. Пры гэтым з 1 чэрвеня пагранічнікі ў пунктах пропуску атрымалі права забіраць несапраўдныя дакументы (пашпарты, пасведчанні на права жыхарства, пашпарт марака і інш.) і накіроўваць іх у адпаведныя органы для спісання. «Сістэма нацэлена на навядзенне парадку ў гэтай сферы, выключэнне ўмоў для розных махінацый з дакументамі. Бо некаторыя часам хітруюць, заяўляюць, што дакумент, нібыта, укралі, і атрымліваюць другі пашпарт», — адзначыў Аляксандр Цішчанка. Ён таксама растлумачыў, што пры спробе перасячэння мяжы з дакументам, у якога скончыўся тэрмін дзеяння, яго забіраць не будуць. У гэтым выпадку ўладальнік такога дакумента проста не зможа выехаць за мяжу. Аляксандр Цішчанка расказаў, што ўжо 1 чэрвеня пагранічнікам давялося на практыцы прымяніць новаўвядзенне. У пункце пропуску на граніцы з Украінай у жанчыны забралі прад'яўлены пашпарт, які яна раней згубіла, але потым знайшла і не здала ва ўстаноўленым парадку. Несапраўдныя дакументы выяўлялі і ў перыяд доследнай эксплуатацыі сістэмы (але тады пагранічнікі абмяжоўваліся толькі папярэджаннем). Быў выпадак, калі мужчына прад'явіў несапраўдны дакумент, а калі яму аб гэтым паведамілі, ён дастаў з кішэні другі пашпарт.

## ВЫБУХ ГАЗУ ЗНІШЧЫЎ ДЗІЦЯЧЫ САД

Выбухам газу, які адбыўся ў Кракаве ў ноч на 4 чэрвеня, цалкам разбураны будынак дзіцячага сада.

Камандуючы пажарнай вартай Кракава Рышард Гачол паведаміў, што абломкі сцен разляцеліся на некалькі дзясяткаў метраў. Даных аб ахвярах, паводле яго слоў, пакуль няма. На месцы здарэння працуюць пажарныя, высвятляюцца прычыны выбуху. Таксама выратавальнікі вядуць пошукі магчымых пацярпелых або загінулых падчас ЧП.

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### «ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7

У мінулых выпусках мы аб'явілі сёмы конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках-64.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, яго суддзя і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць пільнымі і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя разгалінаванні альбо якія не развязваюцца.

Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе 24 заданні, падрыхтаваныя вядучым рубрыкі са сваёй практыкі, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём чарговыя з іх:



№ 5. **Белыя:** a7, b6, f2, h4, h6 (5). **Чорныя:** d4, d6, d8, e3, e5 (5).

№ 6. **Белыя:** b6, c7, d6, e5, f6, g5, h6 (7). **Чорныя:** a7, b4, e3, f8, g3, h2 (6).

Пашукайце пераможныя камбінацыі.

### АЎТАРСКІ-11

Пачынаем гэты конкурс рашэнняў камбінацыйных сярэдніх праблем міжнароднага гросмайстра, чэмпіёна свету па складанні мініпраблем Уладзіміра Матуса (Масква) на яго прызы. Акрамя таго, ён — класіфікацыйны з нормай першага спартыўнага разраду па шашках-100. У ім усяго будзе не меней 16 заданняў. Вось першае з іх:



**Белыя:** 11, 19, 21, 23, 24, 25, 27, 29, 30, 31, 48 (11). **Чорныя:** 8, 9, 12, 13, 18, 22, 28, 32, 33, 36, 38, 40 (12). Выйгрыш.

### БЛІЦ-54/5

Яго працягвае Аляксандр Шурпін (Клімавічы) сваёй новай задачай:

**Белыя:** 10, 11, 19, 20, 24, 39, 40, дамкі 42, 45, 48, 49 (11). **Чорныя:** 5, 7, 8, 9, 16, дамкі 2, 12 (7). Замкнуць простую чорных.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**Аўтарскі-10/15** (В. Шульга): g3 (f4) f8, a:g5 (d6) f6, h6 (g3) e3 (h2) g1x.

**Мемарыяльны** (П. Шклудаў, М. Грушэўскі): **№ 6** — bc7, ef8, h8, d4, b6, d6 (a7) c5 (f4/h4) f2x і **№ 7** — ef8, h8, d4, g3, b6, a1x.

**Бліц-54/1** (Л. Вітошкін): 37, 44, 40, 9, 4 (12-18) 10 (24A) 19 (29) 2 (33) 7 (22) 16x. A(18-23) 15 (28) 4x.

**«Бліскучае выступленне»** (Петрула—Толчыкаў): 1. 3732? 1823! 2. 3212 2332 3. 3827 1318x.

**ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД ОТОПИТЕЛЬНОГО ОБОРУДОВАНИЯ»**
извещает акционеров о проведении внеочередного собрания акционеров **7 июля 2010 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 – зал заседаний.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**
**внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования»:**

1. Об увеличении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в Устав Общества.
3. О приобретении Обществом выпущенных им акций.
4. Об оказании спонсорской помощи.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (профком) с 1 по 7 июля 2010 г. с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 15.00 до 15.45 в день и по месту проведения собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, – документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 1 июля 2010 г.

**Наблюдательный совет**
УНП 100008064. **ОАО «Минский завод отопительного оборудования»**

**К сведению акционеров ОАО «Красный Октябрь»**
С 27 мая 2010 года ведение реестра владельцев ценных бумаг ОАО «Красный Октябрь» осуществляет депозитарий ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенный по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б.
УНП 300003144

## ПЕРАЛІК ТАВАРАЎ ДЛЯ ЛЬГОТНАГА СПАЖЫВЕЦКАГА КРЭДЫТАВАННЯ ПАШЫРАНЫ Ў БЕЛАРУСІ

Урад Беларусі зацвердзіў новы пералік тавараў, для набыцця якіх грамадзянам прадастаўляюцца льготныя крэдыты. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 842 ад 2 чэрвеня 2010 года, якой унесены змяненні і дапаўненні ў пастанову Савета Міністраў ад 1 жніўня 2009 года № 1010. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў Апараце Саўміна.

Пералік тавараў, пры куплі якіх беларускія грамадзяне змогуць выкарыстаць ільготныя крэдыты, уключае шырокі асартымент прадукцыі айчыннай вытворчасці. У прыватнасці, гэта бытавая тэхніка: тэлевізары, DVD-прайгравальнікі, прыстаўкі лічбавага наземнага тэлебачання, пыласосы і мікрахвалевыя печы, маніторы, халадзільнікі і маразільнікі, электра- і газавыя пліты.

На льготным крэдыце можна набыць таксама пральныя машыны, кухонныя машыны, посуд фарфора-фаянсавы. У пералік уключаны абагравальныя катлы і электраводанагравальнікі беларускай вытворчасці.

Ільготнае крэдытаванне прадугледжана і пры рэалізацыі дываноў і дывановых вырабаў, а таксама мэблі і шпалераў айчыннай вытворчасці, дрэваапрацоўчых станкоў.

Акрамя таго, грамадзяне змогуць выкарыстаць ільготныя крэдыты пры куплі тэхнікі: міні-трактароў, мапедаў і матацыклаў, мотаблокаў, прычэпаў.

З прыцягненнем ільготнага крэдыту таксама можна набыць дзвярныя і аконныя блокі, гіпсакардонныя вырабы, дошкі для падлогі, ДСП (у тым ліку ламініраваныя), жалезабетонныя і бетонныя вырабы, вырабы сантэхкерамікі, пячную і дэкаратыўную кафлю, дахавыя матэрыялы, піламатэрыялы, керамічную плітку, паганажныя вырабы, сухія будаўнічыя сумесі, шкло, сценавыя будаўнічыя матэрыялы, паліўныя брыкеты, клееную фанеру, цэмент, электрарадыятары і іншыя прадметы.

Па такой жа схеме магчыма купля касцюмаў і абутку многіх айчынных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, адзення і галаўных убораў з натуральнага футра, паліто, паўпаліто, плашчоў, куртак.

Нагадаем, у адпаведнасці з указам № 152 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2009 г. № 371» усім жадаючым грамадзянам Беларусі ў 2009—2010 гадах прадастаўляюцца крэдыты тэрмінам да трох гадоў з выплатай 10 працэнтаў гадавых на спажывецкія патрэбы для набыцця нехарчовых груп тавараў працяглага выкарыстання. Сума крэдыту не можа перасягаць 300 базавых велічынь, устаноўленых на дату заключэння дагавора (цяпер — Br10,5 млн).

Атрымаць такія крэдыты можна ў Беларусбанку, Белаграпрамбанку, Белінвестбанку і БПБ-Банку.

Для разгляду пытання аб выдачы льготнага спажывецкага крэдыту грамадзянін прадастаўляе ў банк пісьмовую заяву з пазначэннем звестак аб раней прадастаўленых ільготных спажывецкіх крэдытах пры іх наяўнасці. Да яе прыкладаецца копія дакумента, які засведчвае асобу, з прад'яўленнем арыгінала такога дакумента; дакументы, неабходныя для ацэнкі крэдытаздольнасці заяўніка; дакументы з улікам вызначанага банкам спосабу забеспячэння выканання абавязацельстваў па льготнаму спажывецкаму крэдыту.

Паводле даных на пачатак красавіка 2010 года, беларускія банкі выдалі Br21,5 млрд ільготных спажывецкіх крэдытаў насельніцтву.

## ЖЫХАРЫ МАСКОЎСКАГА РАЁНА СТАЛІ ЧАСЦЕЙ МЯНЯЦЬ ПРОЗВІШЧЫ

У загсе Маскоўскага раёна за пяць месяцаў гэтага года зарэгістраваны 105 выпадкаў перамены прозвішчаў, імёнаў і імёнаў па бацьку. Гэта больш чым у паўтара раза больей у параўнанні з аналагічным перыядам 2009 года. Пра гэта паведаміла начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Маскоўскага раёна Наталля Філімонава. Рост адбыўся ў асноўным за кошт маладых, якія адразу пасля вяселля адпраўляюцца ў замежнае падарожжа. Білет, страхоўка звычайна набыты загадзя і аформлены на дзявочае прозвішча. Таму пры рэгістрацыі шлюбу нявеста пакідае сваё прозвішча, каб не мяняць пашпарт. А вярнуўшыся на радзіму, спяшаецца ў загс, каб узяць прозвішча мужа, патлумачыла Наталля Філімонава. Выпадкі ж перамены прозвішча або імені з-за немілагучнасці складае ўсяго пяць працэнтаў ад агульнай колькасці. Нямала паступае і заяў ад жанчын, якія пасля разводу хочуць вярнуць дашлюбнае прозвішча або наадварот — пасля сумесна пражытых гадоў узяць прозвішча мужа. Начальнік аддзела ЗАГС таксама расказала, што за студзень—май гэтага года ў Маскоўскім раёне зарэгістравана 556 шлюбаў і выдадзена 1313 пасведчанняў аб нараджэнні. Гэтыя паказчыкі засталіся на ўзроўні мінулага года. Самымі папулярнымі імёнамі для нованароджаных сталі Дар'я, Настасся, Марыя, Іван, Мікіта, Арцём. У ліку рэдкіх і незвычайных — Мар'яна, Амелія, Меліса, Рэната, Серафім, Гардзей, Ігнат, Лаўр, Леў. А аднаго хлопчыка бацькі вырашылі назваць Нілкант.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск-Навіны».**

## На мінскіх могілках устанаўліваюць міні-калумбарыі

На мінскіх могілках новая тэндэнцыя: на старых магілах унутры агароджы ставяць невялікія калумбарыі на 6—8 ячэек. Атрымліваюцца сямейныя пахаванні.

Як паведаміў **дырэктар УП «Спецкамбінат камунальна-бытавога абслугоўвання» Мікалай РАКЕВІЧ**, такія міні-калумбарыі ёсць на Кальварыйскіх могілках, Усходніх, Паўночных — усяго іх каля 30.

Вырашыць праблему дэфіцыту свабодных зямель для стварэння новых могілак дапаможа толькі крэміраванне: «У Германіі, Польшчы крэміруюць да 70 працэнтаў памерлых, у Расіі — больш за 60 працэнтаў. Мы таксама прыйдзем да гэтага. Тым больш што урны з прахам можна пахаваць ва ўжо існуючыя магілы на любых могілках. На Усходніх летась пабудавалі калумбарную сцяну на 120 тысяч ячэек». Сёння крэміруюць каля 33 працэнтаў памерлых мінчан.

Сёлета на могілках у Калодзішчах і Міханавічах будуць устаноўленыя інфармацыйныя тэрміналы, а да 2013 года яны з'явяцца на Паўночных і Чыжоўскіх. «На нашым прадпрыемстве ствараецца электронная база звестак аб нябожчыках і месцах іх пахавання, — паведаміў Мікалай Ракевіч. — У яе ўжо ўведзены звесткі пра ўсіх, хто пахаваны на Усходніх, Заходніх і Ваенных могілках. Тут устаноўлены інфармацыйныя тэрміналы па пошуку пахаванняў. Дастаткова набраць прозвішча і ініцыялы памерлага — і на маніторы высвечваецца нумар участка магілы і схема маршруту. Такая праца вядзецца і на іншых буйных могілках. Да іх адміністрацыйна прымацаваныя невялікія. Таму ў тэрміналах будуць змяшчацца звесткі аб пахаваных на ўсіх 23 могілках, што знаходзяцца ў распараджэнні «Спецкамбіната КБА», незалежна ад таго, магіла гэта ці урна з прахам».

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск-Навіны».**

## ІТАЛЬЯНКАМ ЗАПЛАЦЯЦЬ ЗА АДМАЎЛЕННЕ АД АБОРТАЎ

Малазабяспечаным цяжарным жыхаркам паўночнаітальянскай вобласці Ламбардыя пачнуць прапаноўваць грашовыя выплаты за адмаўленне ад абортаў, паведамляе ВВС.

Сума выплат жанчынам, якія перадумалі рабіць аборт, складзе 4,5 тысячы еўра, якія будуць выплачвацца на працягу 18 месяцаў (па 250 у месяц). Каб атрымаць грошы, італьянкам давядзецца прад'явіць дакументы, якія пацвярджаюць цяжкае матэрыяльнае становішча.

Ініцыятыву абласнога кіраўніка прадказальна падтрымалі арганізацыі, якія змагаюцца з абортамі, і Рымская каталіцкая царква. Крытыкі новаўвядзення назвалі яго «прапагандай», а таксама «кароткачасовай кампенсацыяй за пажыццёвую адказнасць». Аборты ў Італіі афіцыйна дазволена праводзіць з 1978 года.

Інфарм-укол

## НАЧНЫ СОН ДЗЁННЫМ НЕ ЗАМЕНІШ

**Некалькі карысных падказак псіхолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска, Медыцынскага моладзевага цэнтра «Поспех» Веранікі СТОГАВАЙ дапамогуць пераадолець бяссонніцу тым, хто стаміўся з ёю змагацца.**

1. Прачынайцеся ў адзін і той жа час. Прычым як у будныя, так і ў выхадныя дні. Трэба прывучыць арганізм абуджацца ў пэўны час.
2. Не ўжывайце стымулятары: кафеін, нікацін, алкаголь. Сюды ж адносяцца пэўныя медпрэпараты, такія як тэафілін, бэта-аганіст (звычайна ў выглядзе інгалятара). Эфект кафеіну можа доўжыцца да 24 гадзін, таму яго ўжыванне безумоўна ўплывае на сон. Кафеін не толькі перашкаджае заснуць, але і спрыяе частаму абуджэнню. Алкаголь валодае седатыўным дзеяннем у першыя гадзіны прыёму, але потым можа прыводзіць да частых абуджэнняў, пасля якіх не ўдаецца заснуць.
3. Не спіце днём. Вельмі важна наладзіць рэжым засынання з надыходам цемры. Часты дзённы сон можа паўплываць на якасць начнога сну. Карысным можа быць хіба кароткі, 20-хвілінны, дзённы сон, і тое, калі ён не перашкаджае заснуць ноччу.
4. Рэгулярна займайцеся спортам. Такія фізічныя нагрузкі паляпшаюць якасць і працягласць сну. Але заняткі спортам непасрэдна перад сном могуць узбуджаць, што перашкодзіць засынанню. Практыкаванні трэба завяршыць па меншай меры за 3 гадзіны да сну.
5. Пакіньце ложак сну. Ложак прызначаны для сну і заняткаў сэксам, і больш ні для чаго. Калі вы пакутуеце ад бяссонніцы, не вучыцеся, не размаўляйце па тэлефоне, не чытайце, не глядзіце тэлевізар, не слухайце радыё, калі знаходзіцеся ў ложку. Усе гэтыя віды актыўнасці павышаюць актыўнасць і не спрыяюць сну.
6. Не піце і не ешце перад тым, як легчы ў ложак. Вячэра або перакус непасрэдна перад сном актывізуюць стрававальную сістэму і перашкаджаюць заснуць. Калі вы пакутуеце ад страўнікава-страваводнага рэфлексу або пякоткі, вам тым больш важна пазбягаць ежы і піцця перад сном.
7. Стварайце камфортныя ўмовы для сну. Тэмпература, асвятленне і шумы павінны знаходзіцца пад кантролем і спрыяць здароваму сну. Ложак і падушка павінны быць зручнымі. Жывёлы не павінны спаць з гаспадарамі.
8. Пакіньце перажыванні за парогам спальні. Не думайце пра будучыню і не ўзгадвайце мінулае, калі спрабуеце заснуць. Знайдзіце для гэтага іншы час.
9. Скараціце стрэс. Існуе мноства спосабаў рэлаксацыі і метадаў па скарачэнні стрэсу, якія дапамогуць расслабіць цела і розум перад сном. Напрыклад, мышачная рэлаксацыя, тэхнікі глыбокага дыхання, медытацыя і інш.
10. Звярніцеся да псіхолага. Кагнітыўная тэрапія дапамагае людзям, якія пакутуюць ад бяссонніцы, вызначыць і адкарэктаваць непатрэбныя думкі і погляды, якія перашкаджаюць заснуць.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

**Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» проводит повторный открытый аукцион по продаже неиспользуемого оборудования**

**Аукцион состоится 22 июня 2010 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.**
**Продавец и организатор аукциона:** ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

| № лота | Наименование | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. | Сумма задатка с НДС, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Бобинорезательная машина для продольного разрезания рулонов FSL-B1300E | 1999 | **20 517 281** | 2 051 728 |
| 2 | Машина бобинорезательная МРБ | 2000 | **40 303 274** | 4 030 327 |
| 3 | Волокноизмельчительная машина ВИРМ-1,8 | 1992 | **24 000 000** | 2 400 000 |
| 4 | Емкость V=1м³. Е-70000140000СБ | 1989 | **6 200 000** | 620 000 |
| 5 | Емкость V=1м³. Е-70000140000СБ | 1989 | **6 200 000** | 620 000 |
| 6 | Смеситель ЗШ1000В | 1992 | **57 000 000** | 5 700 000 |
| 7 | Смеситель ЗШ-1000 | 1993 | **57 000 000** | 5 700 000 |

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются не позднее 21 июня 2010 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

**Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.**

Последний день подачи заявок: **21 июня 2010 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится **22 июня 2010 года с 13.30 до 14.00** в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения. Демонтаж оборудования проводится за счет покупателя и в стоимость объектов не включается.

## Вулічнае сачыненне на Коласаву тэму



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ёсць меркаванне

## «Дзесяць» — пішам, а «пяць» — трымаем у галаве?

Сутыкаючыся штодзень з ацэнкай ведаў вучняў і прымяненнем крытэрыяў ацэнкі ведаў на практыцы, пачынаеш сумнявацца, а ці кожная работа вучня, ці кожны вусны адказ павінны ацэньвацца па дзесяцібальнай шкале?! Ці магчыма гэта на практыцы? Так, безумоўна, але пры адной умове, што гэта — камп'ютарнае тэсціраванне. А ў астатніх выпадках? Дапусцім, я праводжу апытанне вучня. Пытанне або заданне павінна ацэньвацца па дзесяцібальнай шкале. Калі я апытваю аднаго вучня — тут яшчэ неяк можна без паперкі ўсачыць ход думак вучня і яго адказ. А калі ў мяне франтальнае апытанне? На кожнае такое апытанне я павінен рыхтаваць шпаргалку?! Апошнім часам усё часцей сумняваюся — «сем» трэба было ставіць або «шэсць», «сем» або «восем», «дзевяць» або «дзесяць». Пры такой шчыльнай і насычанай праграме вельмі складана за кароткі прамежак часу, які доўжыцца ўрок, ацаніць веды вучняў па дзесяцібальнай шкале. Кожнае апытанне вучня фактычна ператвараецца ў экзамен. Часам 10 крытэрыяў ніяк не «ўкладваюцца» ва ўрок. Можа рана мы перайшлі на гэту сістэму, бо яна сябе не апраўдвае? Увогуле, у ацэнцы ведаў вучняў, калі іх апытвае настаўнік, вельмі шмат суб'ектыўнасці. Чаму ў 90 выпадках са 100, калі мяняюцца настаўнікі, змяняюцца і адзнакі ў вучняў? Асабліва часта гэта назіраецца пры пераходзе вучняў з пачатковай школы ў сярэдняе звяно, калі мы «страчваем» адразу да паловы выдатнікаў. А параўнайце вынікі цэнтралізаванага тэсціравання і адзнакі ў атэстатах?! Разбежка, часам, даходзіць да 80 працэнтаў!!! А прадузятасць настаўнікаў?! Дзіця прывозіць дыпломы з міжнародных конкурсаў па рускай мове, а ў яго ўсяго 8 балаў за чвэрць! Другі вучань з'яўляецца прызёрам вобласці па лёгкай атлетыцы, аднак па фізкультуры ў яго толькі «дзявятка»! Трэці — мае першае месца ў вобласці па фізіцы, а настаўнік яму выводзіць за чвэрць 9 балаў! Я такіх прыкладаў магу прывесці шмат. Дзеці не разумеюць, чаму яны дабіваюцца высокіх вынікаў на алімпіядах, конкурсах і спаборніцтвах, а ў іх стаіць адзнака ніжэйшая, чым у аднакласнікаў па тым жа прадмеце! Як гэта патлумачыць дзіцяці і бацькам?

А пра рэпетытарства я ўвогуле маўчу! Калі рэпетытарствам займаецца настаўнік, які вядзе ў дзіцяці гэты прадмет у школе, то бацькам варта падумаць пра якасць «высокіх» адзнак свайго дзіцяці. Не выключана, што настаўнік апраўдвае перад бацькамі высокімі школьнымі адзнакамі свае аплатныя заняткі...

Усе добра памятаюць, што калі школа пераходзіла на дзесяцібальную ацэнку ведаў вучняў, было вельмі шмат спрэчак. Упэўнены, што дастаткова было «ўзаконіць» 1 і 2 балы і многія праблемы былі б вырашаны. Вучняў трэба выпускаць са школы з тымі адзнакамі, якія яны заслугоўваюць, а не вызначаць «планку», да якой не адзін дзясятак вучняў «цягнуць за вушы». Ці я не маю рацыі?

**Анатоль САФОНАЎ.**

## НА «ФЛАТЫЛІІ СВЕТУ» ЗНАЙШЛІ НАЙМІТАЎ

**Міністэрства абароны Ізраіля заявіла пра тое, што сярод забітых актывістаў «флатыліі свету» не было выпадковых ахвяр, паколькі ізраільскім вайскоўцам супрацьстаялі 50 добра падрыхтаваных узброеных наймітаў.**

Найміты са зброяй знаходзіліся на турэцкім судне «Мармара», якое ўзначальваў марскі гуманітарны канвой, што накіроўваўся ў сектар Газа, і былі гатовыя ў любы момант даць адпор ізраільскім дэсантнікам. У наймітаў не было ніякіх дакументаў, аднак у кожнага пры сабе меліся канверты з 10 тысячамі долараў, якія былі выяўленыя і канфіскаваныя ў іх пры затрыманні. Намеснік міністра абароны Ізраіля Матан Вільнаі заявіў, што «ўсе дзевяць загінулых у сутыкненнях з ізраільскімі дэсантнікамі актыўна прымалі ў гэтым удзел». «Сярод загінулых не было невінаватых», — упэўнены намеснік кіраўніка ізраільскага абароннага ведамства.

Тым часам ліванскі журналіст тэлеканала «Аль-Джазіра» Андрэ абу-Халіль, які знаходзіўся на борце флагмана «флатыліі свету», заявіў пра тое, што ўдзельнікі гуманітарнага канвою першымі напалі на ізраільскіх салдатаў. Паводле яго слоў, гуманітарныя актывісты наўмысна паранілі і захапілі ў закладнікі чацвярых ізраільскіх вайскоўцаў з першай дэсантнай групы, схаваўшы іх у труме. У той жа час ён катэгарычна аспрэчыў інфармацыю пра тое, што члены флатыліі пачалі страляць па ізраільцянах першымі.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

**Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» проводит открытый аукцион по продаже недвижимости**

**Аукцион состоится 8 июля 2010 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.**
**Продавец и организатор аукциона:** ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика | Начальная цена продажи, руб., с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание склада каустика | Общая площадь 199,3 м², отдельно стоящее, кирпичное, одноэтажное, две рампы, подъезд – авто- и железная дорога. Земельный участок с кадастровым номером 740100000003005144 площадью 0,0554 га. | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 2 | Здание склада СУ-57 | Общая площадь 373,4 м², кирпичное, отдельно стоящее, одноэтажное, 2 рампы, подъезд – автодорога. Земельный участок с кадастровым номером 740100000003005206 площадью 0,2168 га. | 105 000 000 | 10 500 000 |

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Земельные участки расположены в водоохранной зоне р. Днепр, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задаток перечисляется не позднее 7 июля 2010 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

**Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.**

Последний день подачи заявок: **7 июля 2010 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится **8 июля 2010 года с 13.30 до 14.00** в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения.

Краіна здароўя
Выпуск № 21 (190)



## ДА ПЕРШАЙ ЗМЕНЫ ГАТОВЫЯ!

**Летнія лагеры прынялі школьнікаў з усёй краіны**

**Урачыстае адкрыццё аздараўленчага лагера «Лідар» адбылося ў Цэнтры пазашкольнай работы «Маяк» сталічнага Ленінскага раёна. На свята былі запрошаныя дзяўчаты і хлопцы з 25 лагераў, арганізаваных на базе сярэдніх школ раёна. Для юных удзельнікаў, узрост якіх з 6 да 13 гадоў, аддзелам ДАІ Ленінскага РУУС былі падрыхтаваныя віктарыны і конкурсы па бяспецы дарожнага руху «Веласіпедыст», «Я малюю на асфальце», а таксама святочны канцэрт і розныя сюрпрызы.**

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

### САА3 АДМОВІЛАСЯ ПРЫЗНАЦЬ ЗАВЯРШЭННЕ ПАНДЭМІІ ГРЫПУ H1N1

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САА3) адмовілася прызнаць завяршэнне пандэміі грыпу H1N1, паведамляе AP. Пасля кансультацый з незалежнымі экспертамі кіраўніцтва САА3 вырашыла не зніжаць максімальны, шосты ўзровень эпідэмічнай небяспекі інфекцыі. Згодна з заключэннем камісіі, САА3 варта прадоўжыць маніторынг захваральнасці на грып H1N1, а таксама правядзенне мерапрыемстваў па прафілактыцы інфекцыі. Генеральны дырэктар САА3 Маргарэт Чэн адзначыла, што паводле прагнозаў экспертаў, распаўсюджванне грыпу H1N1 прадоўжыцца. САА3 аб'явіла аб павышэнні пагрозы пандэміі грыпу да максімальнага, шостага ўзроўню, і афіцыйна прызнала пачатак пандэміі ў чэрвені 2009 года. Паводле апошніх звестак арганізацыі, лабараторна пацверджаны больш як 18 тысяч лятальных выпадкаў інфекцыі. Да гэтага САА3 аб'яўляла аб пандэміі грыпу ў 1968 годзе. Тады пандэмія прывяла да гібелі больш за мільён людзей ва ўсім свеце.

**Прыміце да ведама**

# Імбір супраць укалыхвання

**Часта людзі і не падазраюць, што схільныя да марской ці паветранай хваробы, і толькі ступіўшы на палубу цеплахода або сеўшы ў самалёт, яны раптам пачынаюць на сабе зведваць сімптомы ўкалыхвання. Яно можа суправаджацца выражанай бледнасцю, галавакружэннем, з'яўленнем халоднага поту, дыскамфортам у страўніку, павышаным слінааддзяленнем, млоснасцю, ванітамі. Прычына з'яўлення гэтых сімптомаў у тым, што арганізм чалавека «атрымлівае супярэчлівую інфармацыю» ад сваіх вачэй і ўнутранага вуха, якое адказвае за раўнавагу. Укалыханне — адна з прыкметаў слабасці вестыбулярнага апарату.**

Як жа папярэдзіць укалыханне?

Людзям, схільным да марской хваробы, перад будучай паездкай не варта пераядаць, трэба толькі крыху перакусіць прыкладна за паўтары-дзве гадзіны да ад'езду. Пры гэтым неабходна выключыць вострую, вэнджаную і тлустую ежу. Не лепшым выбарам будуць і малочныя прадукты, а таксама газаваныя напоі. Алкаголь і тытунь не ўратуюць, а толькі ўзмоцняць млоснасць і галаўны боль, таму ад іх перад паездкай таксама варта адмовіцца ў абавязковым парадку.

Калі ў вас наперадзе падарожжа на цеплаходзе, а вы ведаеце пра тое, што дрэнна пераносіце гайданку, то пастарайцеся заказаць каюту ў цэнтральнай яго частцы; у аўтамабілі займіце пярэдняе сядзенне; у самалёце лепш знаходзіцца ў той частцы, якая размешчана паміж крыламі.

Старайцеся падчас падарожжа адцягнуць сябе ад непрыемных адчуванняў, не варта насцярожана сядзець і чакаць кожную хвіліну, што «вось-вось пачнецца...». Можна, напрыклад, шукаць вачыма лінію гарызонта або глядзець на новыя месцы, якія «прабягаюць» перад вашымі вачыма. За дарогай лепш назіраць праз лабавое шкло, а не праз бакавое. Калі вы адчулі, што вас пачынае ўкалыхваць, то папрасіце спыніць машыну і выйдзіце на свежае паветра, каб падыхаць ім, у крайнім выпадку, адчыніце хоць бы акно.

У некаторых выпадках змагацца з укалыхваннем можа дапамагчы глыбокае і рытмічнае дыханне. Для гэтага трэба рабіць глыбокі ўдых і выдых, рытм якіх павінен складаць прыкладна 10 разоў у хвіліну.

Непрыемныя адчуванні адступаюць або працякаюць у менш цяжкай форме, калі час ад часу вы будзеце абціраць твар і вобласць шыі халоднай вадой.

Калі ёсць магчымасць, то часцей прымайце халаднаваты душ.

Калі ў вас наперадзе доўгае падарожжа, можна запасціся такімі «памагатымі», якія здольныя палегчыць ваш стан. Гаворка ідзе пра лімон (пры ўкалыхванні рэкамендуецца смактаць невялікі яго скрылік), мятныя або кіслыя фруктовыя (лімон, ананас) ледзянцы, шчаўевую кіслату (пры недамаганні прымайце яе ўнутр у невялікай колькасці) або пра розныя вострыя прыправы. Тут можа дапамагчы пах імбіру. Для гэтага трэба капнуць на насоўку 2—3 кроплі імбірнага алею і паднесці да носа на некалькі хвілін, робячы пры гэтым глыбокія ўдыхі.

Каб асвяжыць паветра ў каюце або ў салоне аўтамабіля, пакіньце адкрытым флакон з алеем лаванды. Гэты водар дапамагае змагацца з падступаючай млоснасцю.

У аптэках можна набыць розныя медыкаментозныя прэпараты ад укалыхвання, а таксама гамеапатычныя сродкі.

Пры ўкалыхванні карысная і фітатэрапія: вазьміце 4 часткі кветак рамонку аптэчнага, 3 часткі карэнішча валяр'яну, такую ж колькасць лісця мяты перцавай і ўсё змяшайце. Заварыце 1 ст. лыжку атрыманай сумесі ў шклянцы з кіпенем, накрыйце і настойвайце 30 хвілін, пасля чаго працадзіце. Гэты травяны настой трэба прыняць перад дарогай (адну шклянку), а падчас паездкі піце яго па паўшклянкі два разы на дзень.

Яшчэ адна парада: заўсёды выходзьце з дома загадзя. На той выпадак, каб, адчуўшы набліжэнне млосці, галавакружэння, слабасці (гэтыя сімптомы ўкалыхвання асабліва рэзка праяўляюцца ў духаце і таўкатні), вы маглі выйсці з салона аўтобуса або вагона метро і не спяшаючыся прайсці частку шляху пешшу.

Эфектыўны сродак супраць укалыхвання — рэгулярныя заняткі гімнастыкай, а таксама спартыўныя гульні, плаванне і танцы (у асноўным, бальныя). У дадатак да гэтага карысна рабіць рэзкія нахілы (назад, наперад, налева, направа) і павароты галавой. Калі вам гэта па сілах, то рабіце кулькі, пераваροты на перакладзіне, стойкі на руках — усё гэта цудоўная трэніроўка для вестыбулярнага апарату. Калі ж вы па нейкіх прычынах або з-за свайго ўзросту не можаце выконваць такія складаныя практыкаванні, то для пасіўнай трэніроўкі вы можаце выкарыстоўваць арэлі, каруселі або гамак. Дарэчы, гушкаючы немаўля на руках, мы тым самым стымулюем вестыбулярны апарат дзіцяці. Класічныя забавы накшталт «Паехалі, паехалі па грыбы, па арэхі, у ямку бух!», калі дзіця спачатку гушкаюць на каленях, а потым рэзка апускаюць уніз — ні што іншае, як яшчэ адна разнавіднасць трэніроўкі вестыбулярнага апарату.

**Могилевское городское коммунальное унитарное специализированное автопредприятие объявляет открытый конкурс. Предмет закупки:**

— бульдозер в количестве 1 единицы.

Предложения принимаются до 16.00 07.07.2010 г. по адресу: 212013, г. Могилев, Гомельское шоссе, 58А.

**Справки по тел./факс: 8 0222 47 97 84, 46 14 07.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении конкурса по выбору других, кроме государства, учредителей открытого акционерного общества, создаваемого в процессе приватизации предприятия районной коммунальной собственности**

**1. Полное и сокращенное наименование организации, ее местонахождение:** коммунальное унитарное производственно-торговое предприятие «Аксамит М» (УП «Аксамит М»), г. Молодечно, ул. Космонавтов, 13.

**2. Основной вид деятельности:** производство готовых текстильных изделий, кроме одежды; производство спецодежды; производство верхней одежды.

**3. Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО** — 2231,0 млн руб.

**Доля государства в уставном фонде создаваемого ОАО** — 45,0 %.

**Доля других учредителей в уставном фонде создаваемого ОАО** — 55,0 %.

**4. Условия конкурса:**

4.1. сохранение рабочих мест и профиля организации;

4.2. обеспечение загрузки действующих мощностей предприятия заказами инвестора в течение 5 лет;

4.3. проведение технического переоснащения предприятия в течение 2 лет с объемом инвестиций 100,0 тыс. долл. США;

4.4. проведение ремонта административно-производственного корпуса в два этапа с объемом инвестиций 250,0 тыс. долл. США:

1 этап: ремонт фасада здания до 01.08.2011 г., ремонт системы тепло- и водоснабжения, замена окон на производственных участках до 01.10.2011 г.;

2 этап: устройство пожарной сигнализации, ремонт вентиляции, ремонт внутренних помещений — по 2013 г. включительно;

4.5. компьютеризация предприятия и оснащение современной оргтехникой, объем инвестиций 60,0 тыс. долл. США.

**5. Срок подачи заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами:** до 22 июня 2010 года включительно, до 17.00.

**6. Перечень документов, подаваемых для участия в конкурсе,** — согласно требованиям пункта 11 Инструкции о порядке выбора других, кроме государства, учредителей открытых акционерных, создаваемых в процессе приватизации собственности Молодечненского района, утвержденной решением Молодечненского районного исполнительного комитета от 25 октября 2007 г. № 719 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2008 г., № 164, 9/11841).

**7. Адрес, по которому осуществляется прием заявлений на участие в конкурсе с прилагаемыми документами:** г. Молодечно, ул. Ясинского, 25, отдел экономики райисполкома.

**8. Дата, время и место проведения конкурса:** 8 июля 2010 года в 10.00, г. Молодечно, ул. Ясинского, 25, отдел экономики райисполкома.

**9. Организатор конкурса:** Молодечненский районный исполнительный комитет, г. Молодечно, ул. Виленская, 6.

**10. Номера контактных телефонов организации и организатора конкурса:** 8 0176 771314, 771532; 8 0176 730177, 77 20 24.

**Дзіцячая тэма**

# «КАШЭЧЫ ПАДАРУНАК»

**КАЛІ малое любіць жывёл, гэта, безумоўна, сведчыць пра яго цудоўныя душэўныя якасці. Аднак бацькам трэба быць пільнымі, паколькі бяздомныя сабака або кот могуць не толькі навучыць дзіця клапаціцца аб кімсьці, але і «падарыць» такое непрыемнае захворванне, як стрыгучы лішай.**

З надыходам цяпла рызыка падхапіць стрыгучы лішай павялічваецца. Заразіцца можна ад хворых чалавека і жывёл, праз прадметы хатняга ўжытку. Пашкоджанню грыбком садзейнічаюць мікратраўмы скуры, парушэнні імунітэту. Медыкі таксама адзначаюць пачашчэнне захваральнасці на лішай сярод нованароджаных. Ёсць назіранні інфіцыравання праз дзіцячыя каляскі. Некаторыя бацькі пакідаюць іх на ноч на лесвічнай клетцы, чым карыстаюцца бяздомныя заражаныя каты (яны там спяць). Пасля гэтага ў калясцы могуць знаходзіцца адзінкавыя інфіцыраваныя валасы і лускавінкі жывёлы, непрыкметныя для чалавека, але ў выніку кантакту з імі адбываецца заражэнне дзіцяці.

Узбуджальнікі лішаю — грыбкі-дэрматафіты (даслоўна — які расце на скуры) — «любяць» цяпло і вільгаць, менавіта таму дзеці часцей хварэюць на лішай летам.

Ачагі пашкоджання з'яўляюцца на твары, грудзях, спіне, а таксама на валасістай частцы галавы. На скуры выступаюць плямы акруглай формы, якія спачатку лушчацца, а потым пакрываюцца скурачкамі. Як правіла, плямы не свярбяць, яны абсалютна не баляць, хоць сустракаюцца выпадкі, калі маленькія пацыенты скардзяцца на слабы сверб. У зоне пашкоджання валасы абламаныя на вышыні 4—8 мм і ствараецца ўражанне, што яны быццам «падстрыжаныя» лішаём. Пры гэтым можа павысіцца тэмпература, павялічваюцца лімфатычныя вузлы.

З моманту пападання грыбка на скуру да з'яўлення першых сімптомаў лішаю можа прайсці ад 5 да 15 дзён, а ў некаторых выпадках скрыты перыяд расцягваецца да месяца. Пажадана паказаць дзіця ўрачу-дэрматолагу адразу, як толькі заўважылі плямы на скуры. Ён зробіць саскроб з пашкоджанай паверхні скуры, правядзе агляд валасістай часткі галавы пад спецыяльнай лямпай і пад мікраскопам — і паставіць дыягназ.

Калі стрыгучы лішай не лячыць, плямы стануць больш буйнымі і яркімі, пасля на іх месцы ўтвараюцца рубцы і гнайнічкі, якія доўга не загойваюцца. Калі лячэнне ўвогуле не праводзілася, захворванне пераходзіць у хранічную форму. Да таго ж хворы чалавек будзе пастаянна небяспечным для навакольных як крыніца інфекцыі.

Самалячэннем лішаю займацца нельга!

Калі ў дзіцяці лішай, урачы рэкамендуюць утрымліваць скуру чыстай і сухой. Добра дзейнічаюць на ўзбуджальнікаў лішаю спецыяльныя супрацьгрыбковыя сродкі. Акрамя таго, існуе і вузкаспецыялізаванае мясцовае лячэнне стрыгучага лішаю, якое прызначае ўрач.

Варта адзначыць, што хворага з моманту выяўлення ў яго стрыгучага лішаю да поўнага вылячэння неабходна ізаляваць ад іншых людзей, а ўсіх тых, хто быў з ім у кантакце, агледзець на наяўнасць інфекцыі.

Паколькі грыбок устойлівы ў знешнім асяродку, у доме трэба захоўваць чысціню. Рэчы хворага пракіпяціце, а дываны і дывановыя накідкі прапыласосьце і апрацуйце супрацьгрыбковым прэпаратам. Не насіце агульных галаўных убораў, не карыстайцеся адной расчоскай. Захворванне вельмі заразнае, таму трэба настроіць сябе на некалькі месяцаў кантролю і асцярожнасці.

Як не заразіцца лішаём? Кожны вечар перад купаннем у ваннай аглядайце дзіця. Прывучайце яго да таго, што пасля гульні з любымі, нават хатнімі жывёламі трэба абавязкова мыць рукі з мылам. Патлумачце, што бяздомных кошак і сабак падкормліваць можна, а вось цалаваць нельга, нават калі іх вельмі шкада. Таксама пастарайцеся захоўваць правілы ўтрымання хатніх жывёл: не дапускайце іх знаходжання на ложку, сістэматычна праходзьце агляд у ветэрынарнага ўрача і г.д.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**Ён + Яна**

### МУЖЧЫНСКАЙ ВЕРНАСЦІ НЕ ІСНУЕ Ў ПРЫРОДЗЕ?

**Ці магчыма хоць б тэарэтычна выгадаваць пастаяннага — вернага — мужчыну? Вучоныя сцвярджаюць, што не: хлопчыкам неабходна перажыць некалькі закаханасцяў, завесці сяброўства з дзяўчатамі і паэксперыментаваць з сэксам. Аднак... Псіхолагі адзначаюць, што вернасць мужчыны закладваецца ў бацькоўскім доме і залежыць ад таго, якія адносіны ў таты з мамай. З іх ён у будучыні і будзе браць прыклад.**

Нядаўна з'явілася цікавая тэорыя аднаго брытанскага вучонага, які выказаў меркаванне, што, калі мама перакладвае свае абавязкі на няньку, то яе сын у дарослым жыцці абавязкова завядзе сабе палюбоўніцу. У яго свядомасці замацуецца, што акрамя афіцыйных сямейных адносінаў ёсць куды больш цёплыя і душэўныя неафіцыйныя, таму мужчына будзе шукаць у такой палюбоўніцы яшчэ адну няньку.

Аднак амерыканскія псіхолагі яму пярэчаць: зусім не важна, хто менавіта клапоціцца аб хлопчыку — мама ці тата, бабуля ці нянька. Хлопцу трэба падтрымліваць блізкія духоўныя сувязі з іншымі людзьмі, яму трэба эксперыментаваць з сэксам. Самае ж галоўнае ў тым, якую мадэль адносінаў бачыць перад сабой дзіця. Калі ён з ранняга дзяцінства назірае, як тата не надта ўжо і верны маме, то і сам ніколі не будзе прыхільнікам манагамнасці.

Такім чынам, калі вы хочаце, каб ваш сын вырас у прыстойнага мужчыну, то пакажыце яму той прыклад, да якога ён павінен імкнуцца. Калі тата і мама шчыра кахаюць адно аднаго, то і іх сын будзе старацца стварыць такую ж мадэль сваёй сям'і ў будучыні. І гэта дасць хоць якую-небудзь надзею на мужчынскую вернасць.

### ДЭПРЭСІЯ ЧАСЦЕЙ АТАКУЕ ЖАНЧЫН

**БРЫТАНСКІЯ вучоныя правялі даследаванне, вынікі якога сведчаць: жанчыны больш схільныя да дэпрэсіі, чым мужчыны. 80 % слабага полу рэгулярна або час ад часу бываюць не ў настроі або адчуваюць, што яны не ў стане справіцца з сітуацыяй.**

Як удалося высветліць спецыялістам, галоўнай прычынай дэпрэсіі з'яўляюцца матэрыяльныя праблемы: больш як палова ўсіх апытаных паведаміла, што яны непакояцца з-за свайго матэрыяльнага становішча. Мужчыны часцей звязваюць сваю дэпрэсію з перажываннем дзелавога або фінансавага крызісу, у той час як жанчыны часцей хвалююцца з-за сямейных або партнёрскіх адносінаў.

Медыкі папярэджваюць, што нават лёгкую форму дэпрэсіі неабходна своечасова выяўляць і лячыць. У адваротным выпадку развіццё хваробы пойдзе далей. Гэта можа прывесці да пераходу захворвання ў цяжкую форму і нават стаць прычынай разбуральных і асацыяльных паводзінаў: злоўжывання спіртным, прагулаў на працы, канфліктаў у сям'і.

### МУЖЧЫНЫ БОЛЬШ НІЧОГА НЕ ВЫРАШАЮЦЬ... АМАЛЬ НІЧОГА

**АДРАЗУ некалькі даследаванняў, праведзеных амерыканскімі і англійскімі вучонымі, пацвердзілі поўнамаштабнае адступленне моцнага полу ад прывычных лідарскіх пазіцый. Медыцына пакуль не можа патлумачыць, чаму з кожным новым пакаленнем мужчыны становяцца ўсё больш нерашучымі. Сацыёлагі ж мяркуюць, што звязана гэта са зменай сацыяльных роляў моцнага і слабага полаў.**



Для мужчын гэта статыстыка можа падацца палохаючай — да 2020 года ўсёй сусветнай эканомікай будуць кіраваць жанчыны. Не, гэта не значыць, што банкі і фінансавыя кангламераты апынуцца ў руках слабага полу, усё значна прасцей. Пераважную большасць рашэнняў аб сямейным бюджэце — значных пакупках у сем'ях (дача, аўтамабіль, банкаўскія ўклады, паездкі за мяжу і г.д.) — будуць прымаць толькі жанчыны. А менавіта на гэтым і трымаецца сусветная эканоміка. Што да «дробязяў», накшталт набыцця прадуктаў, адзення, паходаў у кіно і да т.п., то жанчыны ўжо кантралююць 80 % рашэнняў, звязаных з гэтымі тратамі.

Калі ўзяць такія галіны сямейнага бюджэту, як значныя пакупкі для хатняй гаспадаркі, месца размяшчэння дома або кватэры, расходы на лячэнне, то амаль у палове сем'яў мужчыны не маюць права голасу ў прыняцці гэтых рашэнняў. Моцны пол або ўхіліўся сам, або быў «адсунуты» слабым полам. Удумайцеся ў гэтыя лічбы — палове мужоў жонкі не даюць магчымасці нават пацiскаць уволю пультам для тэлевізара!

Няўжо мужчыны начыста пазбаўлены якога-небудзь выбару ўвогуле? Не, пакуль што мужчыны яшчэ маюць магчымасць выбіраць... жанчын. Ці надоўга?

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# МАТУЛІН КУФЭРАК

**ЦЯЖАРНЫМ жанчынам варта зараней падумаць, як яны будуць карміць свой маленькі цуд. У дзетак, якія атрымліваюць мацярынскае малако, — моцны імунітэт, і развіваюцца яны значна хутчэй, чым іх аднагодкі, якія знаходзяцца на ненатуральным кармленні. Пра тое, з якімі праблемамі могуць сутыкнуцца маці, якія вырашылі карміць грудзямі, а таксама пра тое, як кожны з нас можа падтрымаць маці малога, расказвае <u>кансультант па грудным кармленні Наталля РАЗАХАЦКАЯ</u>.**



***— Наталля, раскажыце, хто такія кансультанты па грудным кармленні і чым яны займаюцца?***

— Звычайна гэта мамы, якія мелі паспяховы вопыт па грудным кармленні свайго дзіцяці больш за год і якія прайшлі спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы кансультантаў. Гэтыя курсы арганізоўваюцца пры спецыяльных сямейных цэнтрах. Што датычыцца мяне, то ў мяне двое сваіх дзетак, якіх я карміла грудзямі кожнага да двух з паловай гадоў. Асноўная задача кансультантаў — прапаганда і заахвочванне натуральнага кармлення: выступленне ў бальніцах, паліклініках і работа са СМІ. А таксама непасрэдная кансультацыя матулек, у якіх узнікаюць праблемы.

Першая праблема, з якой сутыкаюцца мамы, гэта лактастазы (застоі малака), траўмы саскоў, недахоп малака, ці наадварот гіперлактацыя. Мы расказваем будучым мамам, як правільна прыкласці немаўля да грудзей, каб яны ведалі, што рабіць у радзільні. Праводзім таксама кансультацыі па ўвядзенні прыкорму немаўляткам, расказваем, як правільна сумясціць працу і натуральнае кармленне, і ўвогуле вядзём пары да самага адлучэння ад грудзей. У нашай краіне гістарычна склалася так, што ненатуральнае кармленне папулярнае нараўне з натуральным і нават пераважае. Таму трэба вяртаць разуменне, што натуральнае кармленне вельмі важнае для немаўляці.

***— А чаму так важна карміць грудзямі?***

— Натуральнае кармленне вельмі важнае для маці і дзіцяці, таму што гэта і ёсць паўнацэнныя адносіны паміж імі. Калі матуля корміць сваім малаком, яна рэалізуе сябе як маці, у яе выпрацоўваюцца «правільныя» гармоны. Да таго ж, гэта прафілактыка пасляродавых ускладненняў (крывацёкаў, дэпрэсіі і інш.). Для дзіцяці — гэта перш за ўсе здароўе і больш хуткае развіццё мозгу. Дзеці, якіх кармілі грудзямі, заўсёды на некалькі пунктаў разумнейшыя, чым тыя, якіх кармілі ненатуральна (даследаванне праводзілі на школьніках). Малочныя сумесі для немаўляткі — гэта чужародная ежа, а мацярынскае малако змяшчае ў сабе ўсё тое, што неабходна для малога, каб развіць менавіта чалавечае дзіця... Зразумела, калі стаіць пытанне выжывання, то можна карміць і сумессю, але ніколі гэта не павінна быць пытаннем выбару.

***— Да якога ўзросту трэба карміць немаўля мацярынскім малаком?***

— Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе карміць як мінімум да двух гадоў, а затым натуральнае кармленне можа працягвацца па жаданні матулі і дзіцяці. Станаўленне лактацыі адбываецца да трох месяцаў, потым наступае сталая лактацыя, а пасля двух гадоў — згасанне. Так натуральна можна спыніць кармленне. Калі рабіць гэта рэзка, то гэта тое самае, што скокнуць з цягніка на поўнай хадзе: ні гарманальная сістэма, ні дзіця да гэтага не гатовыя. І калі гэта адбываецца рэзка, з дапамогай таблетак ці перавязвання, могуць узнікнуць ускладненні — саб'ецца гарманальны фон ці з'явіцца мастапатыя. А для дзіцяці гэта — псіхалагічная траўма, аслабленне імунітэту, у выніку чаго малое пачынае хварэць.

***— Вы казалі, што жанчыны, якія кормяць грудзямі, сутыкаюцца з некаторымі праблемамі. Як з імі справіцца?***

— Сутыкаюцца з праблемамі адразу ў радзільні, калі малога разлучаюць з матуляй і дакормліваюць сумессю. У выніку — малое дрэнна ссе ці зусім адмаўляецца, а бывае, што і траўмуе сасок. А потым, як па замкнутым коле, — застой малака ці яго недахоп, іншымі словамі, механізм лактацыі не запускаецца як належыць.

Такая праблема, як лактастаз пачынаецца з зацвярдзення ў грудзях, яны чырванеюць, у маці павышаецца тэмпература. Першае і самае галоўнае лячэнне — частае прыкладанне малога да грудзей. Калі праз тры дні жанчыне не становіцца лепш, можа пачацца неінфекцыяваны мастыт, а яшчэ праз тры — інфекцыяваны. Увогуле, за першыя тры дні жанчына можа справіцца сама, але часцей за ўсё жанчыны пачынаюць панікаваць і бегаць па ўрачах, а дзіця ў гэты час прапускае паўнавартаснае кармленне і плача. Менавіта тады ні ў дзіцяці, ні ў мамы нічога не атрымліваецца. Насамрэч трэба супакоіцца, легчы з дзіцем у ложак і чакаць, пакуль немаўля не вып'е ўсё малако. Так, за адзін раз гэта можа не атрымацца, але тут патрэбныя цярпенне і навыкі. Можна выкарыстоўваць і народныя сродкі: намазаць грудзі мёдам, прыкласці да іх капусны ліст, але ні ў якім разе нельга прыкладваць спіртавыя кампрэсы і камфорнае масла. Антыбіётыкі можна пачынаць піць толькі пасля трэцяга дня, калі нічога іншае не дапамагло, і піць іх трэба абавязкова поўным курсам. І гэта не значыць, што маці, як толькі ёй стала лягчэй, можа ўскочыць і паляцець свае справы рабіць. Яна павінна разумець, што яшчэ хварэе, і таму павінна заставацца дома, часта прыкладваць малога да грудзей, рабіць кампрэсы і не нервавацца.

Яшчэ адна вельмі папулярная праблема — гэта недахоп малака. Вельмі часта матулі ўводзяць малому прыкорм неабгрунтавана, таму што ім здаецца, што малака стала мала. Насамрэч яго не становіцца мала, проста змяняюцца паводзіны дзіцяці. Яно менш спіць, можа пакапрызіць калі корміцца, а грудзі перастаюць напаўняцца як раней. Перад тым як пачаць даваць сумесь, трэба палічыць, колькі разоў у суткі малое мочыцца: калі не менш за дванаццаць, то значыць з малаком на 99 працэнтаў усё добра. Калі ж немаўля мочыцца часта, але прыбаўка вагі вельмі малая (менш за 125 грамаў у тыдзень), то тут, безумоўна, трэба звярнуцца да педыятра ці кансультанта. Але часцей за ўсё малая прыбаўка вагі выкліканая няправільнай арганізацыяй кармлення (нельга карміць па рэжыме, даваць малому соску і паіць вадой ці чаем). У пачатку свайго жыцця малое павінна піць малако па сваім патрабаванні, а гэта не менш за 12 разоў за суткі. Як правіла, калі ў матулі арганізаваны сумесны сон з дзіцем, праблем з кармленнем не ўзнікае.

Яшчэ адна праблема, з якой жанчыны могуць сутыкнуцца пры кармленні грудзямі, — гіперлактацыя. Гэта калі ў матулі прыбаўляецца зашмат малака. Першае, што трэба зрабіць у такім выпадку — перастаць сцэджвацца. Вельмі часта жанчыне раяць рабіць гэтую працэдуру пасля кожнага кармлення. І калі маці сцэджваецца, то яе арганізм рэагуе так, быццам у яе не адно дзіця, а двое, і таму вырабляе шмат малака. Прычынай гіперлактацыі можа быць і прыродная асаблівасць (ну проста матуля такая супермалочная) і гарманальны збой. Тады трэба павялічыць «дзяжурства» адной цыцкі (не даваць дзве за адно кармленне), адмовіцца ад сцэджвання і не піць чаю, які стымулюе выпрацоўку малака.

***— Як, на ваш погляд, грамадства можа падтрымаць мам, якія вырашылі карміць сваё немаўля натуральным малаком?***

— Мы распрацавалі ў Беларусі спецыяльны значок і налепкі з сілуэтам матулі і дзіцяці з надпісам «Мы вітаем мам, якія кормяць». Мы прапануем розным арганізацыям, універмагам і кавярням вывешваць іх пры ўваходзе (праект глядзіце на сайце go.am-am.info). Маці, убачыўшы такі значок, зразумее, што там яе падтрымаюць і выдзеляць ёй куток, дзе яна зможа пакарміць немаўля. Гэта дапаможа жанчынам быць больш актыўнымі і мабільнымі: яны без праблем змогуць хадзіць па крамах, у госці і нават на працу. Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе карміць немаўля да шасці месяцаў толькі маміным малаком. Таму жанчына, якая вырашыла карміць свайго малога па патрабаванні, не павінна адчуваць сябе дыскамфортна, калі немаўля папрасіла паесці ў грамадскім месцы. Напрыклад, у Гродне нашу грамадскую ініцыятыву падтрымалі шмат арганізацый, у тым ліку цэнтральны ўнівермаг і кавярня. А вось кіраўніцтва адной з кавярняў у Мінску палічыла, што гэта будзе выглядаць непрыстойна.

Сёння, на жаль, страчана традыцыя ўспрымаць маці, якая корміць грудзямі, як нешта натуральнае. Жанчыны стараюцца пакарміць малое непрыкметна: носяць малога ў слінгу і прыкрываюцца хусткай. Аднак у нас яшчэ можна сустрэць «касыя» позіркі і незадаволеныя твары. Але не ўсё загублена, пацiху справа рухаецца і ў хуткім часе, я ўпэўненая, беларускіх матулек падтрымаюць. Гэта сапраўдны бонус для любой установы. Па-першае — пазітыўны вобраз, які падтрымлівае здаровы лад жыцця. Па-другое — прыцягненне кліентаў: цяжарных і матулек з сем'ямі, і пры гэтым — ніякіх выдаткаў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# РЭЦЭПТ ПОСПЕХУ

## Рабі лекі справна — і ўсё будзе слаўна! Прынамсі ўзор Нясвіжскага завода медпрэпаратаў дэманструе дзейснасць такой догмы



Намеснік дырэктара па якасці Зміцер ШАХНІЦКІ і хімік Наталля ШЫМКО ў лабараторыі прадпрыемства з найсучаснейшым абсталяваннем.



У аддзяленні прамежкавага захоўвання і кантролю якасці прэпаратаў. На першым плане кантралёр Алена УРУБЛЕЎСКАЯ.





Зусім нядаўна здадзены ў эксплуатацыю сучасна абсталяваны склад гатовых лекавых сродкаў.

Лоўкія перасоўванні мініяцюрнага пагрузчыка, здольнага ўзняцца на чатыры ярусы ўвысь і неўзабаве прызямліцца з новым нагружаным паддонам, узяць каробку злева і перакласці яе направа без развароту, падаюцца нерэальнымі, фантастычнымі. Не толькі таму, што дзівосныя механізмы нагадваюць пра эру робатаў і штучнага інтэлекту. І нават не таму, што такіх суперабсталяваных складоў у Беларусі — раз, два і аблічыўся. Больш за ўсё перашкаджае верыць у рэальнасць убачанага тая акалічнасць, што ў мінулы наш прыезд на месцы гэтых новенькіх высачэзных стэлажоў і мудрагелістых машынак (дзякуючы якім удаецца выйграваць у прасторы і складзіраваць больш) было... А нічога і не было насамрэч, так нейкія накіды будоўлі і прыгожыя словы пра вузкапрахадную тэхналогію і тры тысячы палета-месцаў. Аднак цяпер мы пераконваемся, што за словамі стаіць справа — і без шчыпкоў зразумела, што нам гэта не сніцца.

Прадпрыемству — падмога: больш няма патрэбы арандаваць памяшканні. Супрацоўнікам — камфорт: ля склада месцяцца аддзел маркетынгу, бытавыя і працоўныя пакоі для грузчыкаў і кіроўцаў.

Апроч новага склада «намаляваўся» і новы рынак — ёсць цікавая прапанова з Судана.

— Стартавая пляцоўка для нашага экспарту ў Афрыку, — кажа **дырэктар Сяргей ПРАСМЫЦКІ.**



Дырэктар Сяргей ПРАСМЫЦКІ.

Сапраўды, руплівая праца не ведае межаў. На нашым кантыненце прапаноў таксама хапае. Да ліку новых імпарцёраў нясвіжскай лекавай прадукцыі — інфузійных раствораў — хутка прымкне Малдова.

— Мы далі заяўку на рэгістрацыю там 15 прэпаратаў — у поліэтыленавай тары па тэхналогіі Bottlepack. У адрозненне ад астатніх экспартных рынкаў, дзе наша прадукцыя зарэгістраваная ў шкле, — адзначае кіраўнік прадпрыемства.



Галоўны інжынер Наталля МАРКАЧЭЎСКАЯ.

Завод ужо літаральна ў кроку ад атрымання міжнароднага сертыфіката GMP. Цяпер тут працуюць над выпраўленнем асобных хібаў паводле рэкамендацый, выказаных замежнымі спецыялістамі, і спадзяюцца, што з другога разу ўсё будзе «ў ажуры». Па сутнасці сертыфікат — гэта «білет» на новыя рынкі. Карацей, да 50-гадовага юбілею прадпрыемства падыходзіць у меру «ўкормленым», у самым росквіце сілаў ды ў новай якасці — нядаўна яно рэарганізаванае ў ААТ.

Вытворчасць, паводле ўсіх законаў рынку, вельмі чуйна рэагуе на патрэбу:

— Са дня на дзень чакаем рэгістрацыйных пасведчанняў на кардыяплягічныя растворы (пры дапамозе якіх праводзяцца аперацыі на адкрытым сэрцы). Леташняя эпідэмія грыпу паказала недахоп беларускіх антыбіётыкаў, асабліва апошніх пакаленняў. Таму ўводзім антыбіётыкі 4, 5-га пакалення. Пачатая ўжо рэгістрацыя моксіфлаксацыну, цяпер вывучаем стабільнасць узораў лекавага сродку, у будучыні плануем прамысловы выпуск. Так што да наступнай хвалі грыпу — якім бы ён ні быў, хоць казіным — мы будзем гатовыя, — запэўнівае дырэктар. — Разлічваем выпусціць два арыгінальныя прэпараты — рэагімін і гікавен — шырокага спектра дзеяння, надзвычай эфектыўныя пры пнеўманіі. Увогуле вядзём работу па павелічэнні ў нашым асартыменце дарагіх прэпаратаў.

Абсталяванне, балазе, дазваляе: сучасныя вадкасныя і газавыя храматографы, спектраметр ІК-Фур'е, лічбавыя палярыметр і рэфрактометр, а таксама лічыльнік нябачных часцінак. Апошні выкарыстоўваецца для выбарачнага кантролю — як дадатковая страхоўка, якая змяншае ўплыў чалавечага фактару. На гэтыя і іншыя нядаўна набытыя наваночаныя прылады пайшоў больш як мільярд рублёў. Рамантуюцца памяшканні. Пакрысе аднаўляецца, абзаводзіцца новым абсталяваннем і «старая» вытворчасць інфузійных раствораў — у шкле.

— Ужо закупілі лінію мыцця, разліву, закаркоўвання і ўкручвання, прыступаем да будаўніцтва чыстых памяшканняў, мантажу абсталявання, навучання персаналу, — дзеліцца навінамі **галоўны інжынер Наталля МАРКАЧЭЎСКАЯ.** — Абсталяванне, гэтаксама, як і ў новай вытворчасці, адпавядае нормам GMP, спрыяе энергазберажэнню і грошы дазваляе эканоміць. Напрыклад, дыстыляцыйная ўстаноўка, што забяспечвае вадой для ін'екцый — а гэта наша асноўная сыравіна і прадукцыя адначасова — змяншае выдаткі ўдвая (у параўнанні з ранейшай вытворчасцю).

Па сутнасці чарговая рэканструкцыя пройдзе па аналогіі з арганізацыяй вытворчасці ў bottlepack.

— Пераабсталяванне ўплывае на якасць прадукцыі, — падкрэслівае галоўны інжынер, — мы клапоцімся пра нашых спажыўцоў. Паляпшаюцца ўмовы працы. Зноў жа энергазберажэнне. І нарасціць аб'ёмы пры неабходнасці, натуральна, не будзе праблемай.

Наколькі гэта магчыма, штат абнаўляецца, заробкі павышаюцца (у сярэднім на заводзе атрымліваюць па 935 тыс.), хоць неймаверна дарагія крэдыты і не спрыяюць такім захадам (падвоены фонд заробкаў даводзіцца штогод аддаваць банку ў лік пазыкі). Гэтак жа, як і дзяржаўнае рэгуляванне цэнаў на лекі паралельна з адменай дзяржзамовы на іх. Аднак у кіраўніцтва нават на такую няскладнасць знойдзецца рэцэпцік:

— Энергазберажэнне будзем укараняць па максімуму (вось, напрыклад, уцяпленне задумалі), а пастаўшчыкоў шукаць з больш якаснымі субстанцыямі — трэба ж неяк выжываць.

Прапрацоўваецца бізнэс-план па вытворчасці гема-кансервантаў і сістэм для захоўвання крыві, на тым жа абсталяванні можна будзе наладзіць выраб амінакіслот і парэнтэральнага харчавання на іх аснове. Гэта перспектыва на найбліжэйшыя некалькі гадоў, калі ўсё пойдзе добра, — ужо вядуцца перамовы з нямецкім бокам.

Не здадзеная ў архіў і ідэя аб выпуску бактэрыяльных канцэнтратаў для малочнай прамысловасці. Паралельна можна разглядаць магчымасці стварэння кансервантаў для донарскіх органаў. Пляцоўкай для рэалізацыі гэтага праекта абраны менавіта НЗМП з-за свайго багатага мікрабіялагічнага мінулага (раней тут быў біязавод, захаваліся і кадры, і ноу-хау). Ідэі ёсць, засталося знайсці сродкі для іх увасаблення. Справа — за інвестарам.

— Мы пазнаёміліся з такой вытворчасцю ў датчан, — згадвае Наталля Маркачэўская, — у іх там цэлы навуковы цэнтр. Вось гэтага нам сапраўды нестае. Аднак там буйное прадпрыемства ў стане ўкладваць шмат грошай у навуковыя распрацоўкі, мы ж сабе гэтага пакуль дазволіць не можам...

Так і хочацца пажадаць, каб «маглося» ўсё і нават больш. Ды юбілей не за гарамі — ужо ў жніўні, — а ў дзень нараджэння жаданні павінны збывацца! Ім у падмогу — праца, праца і яшчэ раз праца.

**Зоя ВАРАНЦОВА,**
**Алена ДАЎЖАНОК,**
**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**

УНН 600031159.

---

Глядзі і чытай сваё!

# У колеры белым



Фота БЕЛТА.

Мастак з букетам... Не, гэта не карціна з выставы Леаніда Шчамялёва. Хоць кветкі ён вельмі любіць, асабліва белыя. Кожны букет, які з'яўляецца ў доме, для яго становіцца падставай пісаць карціну. Людзей таксама ён любіць маляваць. Аднак сам Шчамялёў з букетам — гэта будзе вельмі папулярны сюжэт лета. Ён ужо зараз папулярны — з таго моманту, як у галерэі «Мастацтва» адкрылася выстава яго жывапісу. Для яе ёсць нагода: народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў названы лаўрэатам прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.

Але для самога аўтара вельмі важна яшчэ і тое, дзе і як гэтая прэмія будзе ўручацца — у яго родным горадзе, падчас фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». У землякоў Шчамялёва, напэўна, будзе магчымасць паглядзець у тыя дні яго творы — гэта было б справядліва. Бо частка малой радзімы ёсць у яго творах. Ці то гэта «Успаміны пра Віцебск» (праца 1994-га года), ці то амаль нядаўняя, пяць гадоў таму створаная праца «Музычны Віцебск». Ён малюе любімы горад у поўным буянні яго мірнага жыцця — ведае, наколькі крохкім яно можа быць, бо вярнуўшыся з вайны, не пазнаў Віцебск, які ляжаў у руінах і аднаўляўся наноў. Як наноў пачалося пасля вайны жыццё самога Шчамялёва — яно напоўненае мірам, мастацтвам, любоўю і каханнем.

### МІР

Так бывае, што чалавек нараджаецца, будучы ўжо дарослым. У Шчамялёва ёсць адна карціна, дзе ён паказаў сваё нараджэнне — грамадзянскае. Вайна, людзі, якія думаюць пра тое, што трэба бараніць жыццё. Гэтае разуменне прыйшло да яго фактычна тады, калі ён быў юнаком, аднак ужо тады Леанід быў упэўнены, што жыццё чалавеку дадзена дзеля таго, каб паслужыць святлу. Нават калі жыццё прыйдзецца аддаць. Быў гатовы і да гэтага — быў паранены і выжыў. Вайну прайшоў усю — ад 41-га па 45 год. Праўда, не зусім прайшоў — праскакаў на кані, бо служыў у кавалерыі. Менавіта таму вельмі любіць пісаць коней, прычым не толькі ў ваенных сюжэтах. Вось, напрыклад, твор «Незнаёмка» — дзяўчына з канём. Сучасная, прыгожая, рамантычная. Само ўвасабленне міру. Відаць, Бог спецыяльна бярог чалавека, талент якога раскрыўся пасля вайны. Шчамялёў прыйшоў у мастацтва ўжо сталым чалавекам, які ведаў, дзеля чаго і што будзе казаць праз творы. Два жывапісныя цыклы «Дзеля жыцця на зямлі» і «Гісторыі звязваючая нітка» былі адзначаны прэміяй Саюзнай дзяржавы.

— Такім людзям, як Леанід Дзмітрыевіч, трэба дзякаваць за наша жыццё. За жыццё ў мастацтве. Бо ён пакідае яркі след у мастацтве Беларусі і Расіі, робіць агромністы ўнёсак у адносіны супрацоўніцтва і сяброўства паміж дзвюма дзяржавамі, умацоўвае славянскую культуру, — адзначыў **Павел КУЗЕМЧАК, намеснік кіраўніка прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску**. — Творы знаходзяцца ў калекцыях шмат якіх краін і музеяў свету, напрыклад, у Расійскай Траццякоўцы і беларускім Нацыянальным мастацкім музеі. Калі кожныя два гады ідзе вылучэнне намінантаў на прэмію, яны праходзяць вялікі цярністы шлях, перш чым Вышэйшы савет Саюзнай дзяржавы зацвердзіць лаўрэатаў.

Аднак, калі прагучала імя Леаніда Шчамялёва, ніякіх спрэчак і абмеркаванняў не гучала — гэта было адно з самых лёгкіх пасяджэнняў па прысуджэнні прэмій. Усе члены экспертнага савета ў адзін голас казалі пра тое, як паважаюць гэтага чалавека і праз яго творы бачаць і разумеюць нашу Беларусь.

### МАСТАЦТВА

Беларусь Шчамялёва вельмі розная. Аднак яго творы заўсёды пазнавальныя, незалежна ад таго, на якую тэму ён стварае, — ёсць фірмовы почырк аўтара. І незалежна ад таго, вайну ці мір ён малюе, яго творы напоўненыя святлом. Напэўна, чалавек, які аднойчы выжыў, ведае, што ў свеце пануе насамрэч. Нездарма калегі кажуць пра яго любімы колер — белы. І пра творы, у якіх аптымізм і дабрыня. Кажуць, што здабыць прызнанне калег — заўсёды найбольш складана.

— Адзнака таленту Леаніда Дзмітрыевіча — гэта гонар нашаму мастацтву і Саюзу мастакоў, — адзначыў **Уладзімір САВІЧ, старшыня Саюза мастакоў Беларусі.** — Шчамялёў — годнасць нацыі. Соль зямлі. Гэта наша легенда. Легенда жывая. Вядома, што чым больш легендаў мае зямля, тым яна багацейшая. Я ўдзячны гэтаму чалавеку за тое, што ён — прыклад нам усім. Ён вечна малады, таму што працуе ўвесь час. І яго мастацтва будзе вечна маладое.

Працуе ўвесь час — гэта не проста словы, а сведчанне відавочцаў. Сусед па майстэрні Уладзімір Тоўсцік, напрыклад, бачыць Шчамялёва штодня, калі той прыходзіць працаваць. У любое надвор'е, ёсць пэўны час, які Леанід Дзмітрыевіч прысвячае працы. Можа таму ў яго так шмат твораў?..

Ім мала майстэрні. І нават нягледзячы на тое, што Шчамялёва любяць і цікавяцца яго працамі музеі і прыватныя калекцыянеры, карцін усё адно больш, і з'яўляюцца новыя. Для іх знайшоўся свой дом — адмысловая мастацкая галерэя Леаніда Шчамялёва ў Мінску. Цяпер у Міністэрстве культуры абмяркоўваюць план перспектывы развіцця галерэі, які б дазволіў ператварыць яе ў Міжнародны культурны цэнтр. Каб гэта быў не проста музей ці месца для выстаў, а каб стварылася магчымасць самому мастаку і яго вучням, якіх шмат сярод мастакоў Беларусі, абменьвацца вопытам, прымаць выставы замежных краін, арганізоўваць нашы выставы за мяжой. Каб разам з творцам развівалася і яго галерэя, даючы яму самому сілы ствараць яшчэ, аддаючы іншым часцінку колераў, якімі насычаны яго карціны. І любові да жыцця. Бо сам Шчамялёў — гэта доўгажыхар у мастацтве: 50 гадоў стварае. І такое адчуванне, што кожны новы твор толькі надае яму сілаў. Напэўна, ёсць сакрэт...

### ЛЮБОЎ І КАХАННЕ

Сакрэт просты — умець быць шчаслівым. Ці знайсці сваё шчасце. Захаваць яго. Памножыць. Гэта магчыма, калі любіш тое, што вакол цябе. Калі жывеш дзеля людзей, што побач. Калі росціш тых, хто будзе пасля цябе.

— Леанід Дзмітрыевіч заслужыў пашану, гэта сапраўды вялікае шчасце — дасягнуць і мець узнагароды дзвюх дзяржаў, — кажа мастак Уладзімір Басалыга. — Але не адзінае ў яго жыцці, бо яно ўключае жыццёвую сцяжынку, дзе ён праявіў сябе як мастак з вялікай літары, як грамадзянін, як ваяр за незалежнасць Беларусі. Як муж, бацька і дзед. Гэта вялікае шчасце па жыцці — мець такі шлях. Мець добрую сям'ю. Яго шчасце — у працах, у дзецях, унуках. Вялікая доля гэтага шчасця — яго жонка. Каханне, відаць, аснова ўсіх яго прац, якія знаходзяцца тут і ў розных музеях. Гэта аснова яго моцы і спадзеву, што шлях Шчамялёва будзе доўжыцца.

*Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва прысуджаюцца адзін раз на два гады. Грашовы эквівалент кожнай з іх роўны 1250-разоваму мінімальнаму памеру аплаты працы ў Расійскай Федэрацыі.*

*З 1958 года Леанід Шчамялёў — актыўны ўдзельнік рэспубліканскіх, усесаюзных, замежных, сусветных выстаў і больш чым 20 персанальных. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, узнагароджаны ордэнам і медалём Францыска Скарыны.*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ШАСЦІГАДОВЫ ЯСЬКА ДАПАМОГ ПАЛАЧАНАМ ПЕРАМАГЧЫ ПАД ГРУНВАЛЬДАМ!

## Падрабязней — у дзіцячай кнізе гісторыка Юрыя Усціновіча «Яська і конік ягоны Грыўка»




Юры Усціновіч падараваў дзеткам захапляльную гісторыю пра Грунвальдскую бітву.

Кнігу прэзентавалі ў мінскай «КнігарніЎгалерэі». Калі я выйшаў з прэзентацыі, то прысеў на лаўцы ў дворыку, разгарнуў кнігу і... прачытаў яе ўсю! Так цікава!..

...Палачане збіраюцца біць ворага пад Грунвальдам. Шасцігадовы Яська ў роспачы: бацька пакідае яго дома «бараніць мамку Любашу». Яська пускаецца на хітрыкі — хаваецца ў бацькавым возе. Хлапца знаходзяць і вяртаюць дахаты. І тут здараецца цуд: драўляны конік Грыўка пачынае размаўляць, яны разам з Яськам тры разы акунаюцца ў сутоцы Дзвіны і Палаты. І што б вы думалі? Зразумела, Яська робіцца волатам незвычайнай сілы, а Грыўка — срэбнагрывым баявым канём! Яны паспяваюць дагнаць палачанаў пад Грунвальдам і дапамагаюць ім перамагчы хціўых тэўтонцаў. Пасля Яська вяртаецца, робіцца зноў звычайным хлопчыкам — і слухае расповеды бацькі пра ўласныя подзвігі!..

— Паколькі кніга для дзетак, то яе не варта ўспрымаць як дакладны гістарычны тэкст, — кажа **аўтар Юры УСЦІНОВІЧ, выкладчык гісторыі Полацкага дзяржаўнага універсітэта**. — Аднак, ужыўшы сваю фантазію, я, тым не менш, грунтаваўся на дакладных гістарычных фактах.

Цікава, што спачатку задума была стварыць мультфільм на гэтую тэму. Але маляванне мульціка — справа доўгая і складаная. Таму мульцік яшчэ ствараецца, а кніга ўжо выйшла.

— Для мяне гэта быў першы досвед аздаблення кнігі, — кажа **мастак Іван ІВАНОЎ**. — Гэта надзвычай цікава: ствараць персанажы, аднаўляць выгляд сярэднявечнага Полацка!.. У мультфільме будуць свае распрацоўкі: за аснову персанажаў я ўзяў герояў старажытных малюнкаў са старонак летапісаў — Радзівілаўскага летапісу, Хронікі Быхаўца... Летапісы ажывуць!..

Юры Усціновіч стварыў кнігу з пазіцыі палачаніна. Увогуле Полацк — горад, якім цяжка не ганарыцца; горад, жыхарам якога сорамна не ведаць сваю гісторыю.

— Як палачаніну, мне хацелася засяродзіць увагу на Полацку, — кажа Юры Усціновіч. — Хацелася паказаць, што Полацк быў як бы асобнай дзяржавай у Вялікім Княстве Літоўскім. У сюжэце гэта ёсць: не проста прыйшоў Вітаўт і загадаў палачанам збірацца ісці на вайну, а палачане самі вырашалі, што рабіць. Такая своеасаблівая полацкая дэмакратыя.

Што казаць — палачане і цяпер наперадзе ўсіх. Сёлета, калі мы святкуем слаўную перамогу нашых ваяроў пад Грунвальдам, гэта ўжо другая полацкая ініцыятыва ў гэтай справе. Пра першую мы пісалі нядаўна: перайменаваць адну з вуліц горада ў вуліцу Грунвальдскую.

Самы стары беларускі горад падае годныя прыклады краіне!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.**

Шык-шок



# НАБЫВАЕМ СОНЦААХОЎНЫЯ АКУЛЯРЫ



**СОНЦААХОЎНЫЯ акуляры даўно сталі ўпадабаным аксесуарам модніц. Гэты прадмет не толькі беражэ павекі ад заўчасных маршчын, абараняе вочы ад яркага святла, але і дапамагае схаваць зацікаўлены погляд, а таксама падкрэслівае індывідуальнасць.Стыльныя акуляры, падабраныя ў адпаведнасці з моднымі тэндэнцыямі і формай твару, абавязкова вылучаць вас з натоўпу. Акуляры дапоўняць не толькі спартыўны вобраз, але і вячэрняе ўбранне. Галоўнае — падабраць падыходзячую аправу, а гэта зараз не праблема.**



### ФОРМА

У новым сезоне актуальная класічная квадратная форма акуляраў. Яна пасуе ўсім, калі правільна выбраць памер. Верхні край акуляраў павінен паўтараць лінію броваў. Прытрымлівайцеся гэтага правіла, і вы не памыліцеся ў выбары. Круглыя жаноцкія апраўы таксама не выходзяць з моды, як і какетлівыя апраўы-матылькі. Яны стануць выдатным дадаткам да рамантычнага вобразу.

Арыгінальнымі выглядаюць апраўы формы шматвугольнікаў. Праўда, калі захочаце набыць такія, прыйдзецца запасціся цярпеннем: трэба прымерыць шмат мадэляў, перш чым удасца знайсці адпаведную свайму стылю і форме твару.

Модныя колеры апраў — бардо, охрыстыя адценні, попельны.



### ЛІНЗЫ

Кажучы пра колер лінзаў, неабходна адзначыць, што на піку папулярнасці акуляры з градыентным шклом. Афарбоўка іх пераходзіць зверху ўніз ад цёмнага да светлага, робячы позірк больш выразным. Акрамя гэтага, градыентныя лінзы карысныя для вачэй. Рознакаляровае шкло таксама вітаецца. Карычневы, жоўты, зялёны — ёсць месца для палёту фантазіі. Колер лінзаў модных акуляраў сезону вясна—лета-2010 можа як супадаць з колерам апраўы, так і кантраставаць з ёй. Занадта цёмныя ці яркія лінзы стамляюць вока, адмаўляйцеся ад такіх акуляраў, асабліва калі ведаеце, што прыйдзецца праводзіць у іх шмат часу.

Знаўцы стыльных аксесуараў у апошні час звяртаюць увагу на акуляры з празрыстымі лінзамі. Такія мадэлі не абараняюць вочы, але выдатна выконваюць эстэтычную функцыю.

### ДЭКОР



Альтэрнатывай прыгожай аправе выступае вытанчаная дужка. У калекцыях модных дызайнераў прысутнічаюць акуляры, упрыгожаныя стразамі, золатам, напышлівымі ўзорамі і геаметрычным арнаментам.

Такім чынам, модныя дызайнеры прапануюць разнастайныя мадэлі: ад класікі да авангарда. Модніцам ёсць з чаго выбіраць! Нарэшце, хацелася б сказаць пра тое, што ў пагоні за модай не трэба забываць пра здароўе. Сонцаахоўныя акуляры лепш набываць у спецыяльных крамах, якія гандлююць оптыкай. Добрыя акуляры абавязкова зробленыя са шкла, пластмаса шкодная для вачэй, таму пастаўцеся да пакупкі сур'ёзна. І тады новыя акуляры будуць ахоўваць вочы, а не стануць проста моднай забаўкай.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

